# ПАДАРОЖЖА Ў КАЗКУ



Тыдзень студсавета на філалагічным факультэце заўсёды насычаны дабрачыннымі мерапрыемствамі. Сёлетні год не стаў выключэннем: 14 снежня валанцёры факультэта разам з намеснікам дэкана па выхаваўчай рабоце Вольгай Генадзьеўнай Валошчанка адправіліся ў Вялікалятчанскі дзіцячы дом. Усяго трыццаць хвілін на маршрутцы, кіроўца якой, даведаўшыся пра мэту паездкі валанцёраў, вырашыў іх падвезці да самага будынка дзіцячага дома.

Пакуль хлопцы і дзяўчаты рыхтаваліся да сустрэчы з дзецьмі, зала хутка напаўнялася цікаўнымі гледачамі, якія з нецярпеннем чакалі пачатку праграмы. Гэта было сапраўднае падарожжа ў казку: у госці завіталі добрая Фея, незвычайны Цуд, Сняжынкі, злосная Чараўніца, якая ўвесь час спрабавала сапсаваць свята, але дзеткам атрымалася яе перавыхаваць. І канешне ж, галоўнымі ў гэты вечар былі Дзед Мароз і яго ўнучка Снягурка.

Больш за гадзіну ў актавай зале не сціхалі вясёлы гоман і смех, гучалі навагоднія песні, казачныя героі ладзілі вясёлыя танцы, а пасля ўсіх закружыў шумны карагод вакол святочнай ёлкі. З прыўзнятым настроем і салодкімі падарункамі дзеці пайшлі вячэраць.

Студэнты, у сваю чаргу, адправіліся на экскурсію па дзіцячым доме, якую правёў намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Леанід Уладзіміравіч Дук. Госці зазірнулі ў кожную «сям'ю» (а іх у дзіцячым доме дзевяць: «Сябры», «Надзея», «Любоў» і інш.), з задавальненнем пагутарылі з дзецьмі і выхавацелямі, падзівіліся з утульных пакояў, што былі ўпрыгожаны малюнкамі і вырабамі выхаванцаў.

Адчуванне таго, што агульнымі намаганнямі быў створаны невялікі навагодні цуд, які падарыў радасць і святочны настрой дзецям, саграла душу студэнтаў. І, вяртаючыся ў горад, яны зусім не заўважалі халоднага зімовага надвор'я, бо на твары ў іх была светлая ўсмешка, а на душы – радасць.

**Ірына МІКУЦКАЯ,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**
**Фота М. ТАРАСЕВІЧ,**
**студэнткі 4 курса ФлФ.**